# Хто ў XVI–XVIII стст. суправаджаў маладых магнатаў падчас адукацыйных падарожжаў

*Калтачэнка А. І., аспірант РІВШ,*
*навук. кір. Любы А. У., канд. гіст. навук, дацэнт*

Выхаванне і адукацыя маладых магнатаў у XVI–XVIII стст. складалася з некалькіх этапаў. Першым было навучанне дома. Магнацкія роды наймалі выбітных інтэлектуалаў, якія старанна рыхтавалі дзяцей да наступнага этапа – школьнага. Завяршалася адукацыя магнатаў замежным падарожжам, дзе маладыя людзі слухалі патрэбныя ім лекцыі, наведвалі двары еўрапейскіх манархаў, заводзілі карысныя знаёмствы і прэзентавалі сябе еўрапейскай арыстакратыі. Улічваючы мэты замежных падарожжаў робіцца зразумелым, што магнатаў суправаджала пэўная колькасць людзей, так званы перасоўны двор, сярод якіх былі не толькі слугі, але і прыяцелі, гувернёры і г.д.

Напрыклад, Аляксандр Алелькавіч-Слуцкі (?–1591) ехаў у класічнае для таго чаму адукацыйнае падарожжа, а суправаджалі яго прыяцелі, якія вучыліся разам з князем, гувернёр, сакратар, кур’ер і іншыя. Світа складалася з 11 чалавек, аднак праз год палова з іх вярнулася дадому. Прычына гэтага дакладна не вядома, але мяркуецца, што з-за недахопу грошай [1]. А падарожжа Юрыя Алелькавіча-Слуцкага (1559–1586), старэйшага брата Аляксандра, было не зусім адукацыйным. Мэтай было наладжванне карысных кантактаў і рэпрэзентацыя сярод еўрапейскай арыстакратыі сябе як прадстаўніка старажытнага роду. Таму суправаджаў Юрыя малы двор у які ўваходзілі не толькі маладыя людзі, якія ехалі слухаць лекцыі, але і давераныя сямейныя шляхцічы, служкі. Усяго двор князя складаўся з 14–15 чалавек. А. А. Скеп’ян адзначае, што факт заказу для суправаджаючых вопраткі аднаго колеру і аднолькавага фасону з’яўляецца сведчаннем таго, што гэта была світа князя [1].

Цэнтральнай асобай, ад якой залежаў поспех усяго адукацыйнага падарожжа, быў гувернёр. Ён выконваў ролю арганізатара падарожжа, сачыў за маршрутам і графікам, прытрымліваўся рэкамендацый, з кім пажадана, а з кім не, заводзіць новыя знаёмсты, падтрымліваў рэгулярны абмен лістамі з домам, сам пісаў справаздачы, складаў штодзённы расклад, кантраляваў выдаткі, купляў новыя касцюмы і аплачваў дактароў, калі хтосьці хварэў [2]. Ад гувернёра залежаў выбар прафесароў і лекцый, месца жыхарства, дысцыпліна, распарадак дня. Гэты чалавек павінен быў сачыць за тым, каб малады чалавек не ленаваўся, спраўна вучыўся, сустракаўся толькі з патрэбнымі людзьмі, не звязваўся з благой кампаніяй і г.д. Таму да выбару гувернёра ставіліся вельмі ўважліва.

Лепшым рашэннем было наймаць надзейнага чалавека, які ўжо шмат гадоў звязаны з магнацкім дваром. Напрыклад, Казімір Ян Вайшнаровіч (каля 1620–1677), які суправаджаў маладога Аляксандра Януша Заслаўскага-Астрожскага (1650–1682) у яго падарожжы 1667–1669 гг., меў блізкія кантакты з дваром Радзівілаў. Маці маладога Аляксандра Заслаўскага-Астрожскага, Кацярына Сабеская (1634–1694), пасля смерці першага мужа, Уладзіслава Дамініка Заслаўскага-Астрожскага (1618–1656), выйшла замуж за Міхала Казіміра Радзівіла (1625–1680). Такім чынам Казімір Ян Вайшнаровіч трапіў на пасаду настаўніка і гувернёра маладога Аляксандра Заслаўскага-Астрожскага. Пры гэтым ён выкарыстаў падарожжа для сваіх навуковых мэт і дамовіўся аб выданні ўласных твораў у друкарнях Парыжа і Антверпена [3].

Некаторыя гувернёры, маючы добрыя рэкамендацыі, за сваё жыццё маглі апекаваць некалькіх маладых магнатаў. Так, напрыклад, Марцін Кавецкі (1677 – каля 1751) быў гувернёрам сыноў Станіслава Матеуша Ржэвускага (1662–1728), а пасля сканчэння службы ў Ржэвускіх падпісаў кантракт з Паўлам Каролем Сангушкам (1680–1750) і апекаваў яго сына Януша Аляксандра (1712–1775) [3].

Прадстаўляе цікаўнасць і тое, што выбар настаўніка рабіўся як сярод свецкіх людзей, духавенства, так і сярод вайскоўцаў. Ахмістрам Юрыя Алелькавіча-Слуцкага быў Мікалай Стшэшкоўскі Пшонка (?–1614), слуга і давераная асоба Кацярыны з Тэнчынскіх (1544–1592), маці маладога князя; Казімір Вайшнаровіч быў каталіцкім дзеячом, а Марцін Кавецкі зрабіў вайсковую кар'еру перад выхаваннем Северына Юзэфа (?–1754) і Вацлава Петра (1705/06–1779) Ржэвускіх.

Такім чынам, падчас адукацыйнага падарожжа маладога магната суправаджала даволі вялікая світа, якая складалася з прыяцеляў, настаўнікаў, гувернёраў, ахмістраў, сакратароў і слуг. Цэнтральнай фігурай быў гувернёр, які кіраваў астатнімі слугамі, адказваў за поспех падарожжа, сачыў за паводзінамі свайго падапечнага і пісаў справаздачы дадому.

### Літаратура

1. Скепьян, А. А. Придворные последних князей Слуцких / А. А. Скепьян // Miestas, dvaras, kaimas Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje ir Lenkijos Karalystėje XVI–XVIII a. Lokalinės istorijos problemos / Lietuvos istorijos institutas ; Sud.: Ramunė Šmigelskienė-Stukienė. – Vilnius, 2018. – P. 217–256.

2. Kucharski, A. Guwernerzy Rzewuskich na Podhorcach w XVII–XVIII wieku – szkic do portretu / A. Kucharski, S. Roszak, A. Wieczorek // Społeczne i kulturowe uwarunkowania edukacji Rzeczypospolitej XVI–XVIII wieku : materiały z badań : w 2 cz. / Narodowy Program Rozwoju Humanistyki ; red. Joanna Orzeł. – Warszawa, 2018. – Część 2. – S. 149–183.

3. Kucharski, A. Turystyka i edukacja. Zagraniczna peregrynacja młodego polskiego magnata w relacji księdza Kazimierza Jana Wojsznarowicza (1667–1669) / A. Kucharski // Studia Gdańskie. – 2011. – T. XXIX. – S. 205–227.

## Анализ внешнеполитических предпосылок участия Франции в Семилетней войне

*Кислячук Е. Ю., студ. I к. БГУ,*
*науч. рук. Ковяко И. И., канд. ист. наук, доцент*

В значительной степени Семилетняя война была обусловлена тем, что ни одна из предыдущих войн «за наследство» не решила основных противоречий между крупнейшими государствами Европы. Развитие внешнеполитической ситуации в основном определялось колониальной борьбой Франции и Англии. Уже в 1755 г. начались боевые действия в колониях. Англия четко обозначила свою задачу: «Завоевать Америку в Европе». Англия начала дипломатическую подготовку к войне – поиск союзника против Франции. Сделала ставку на союз с Пруссией, рассчитывая на силу армии Фридриха II и опасаясь захвата Пруссией Ганновера, принадлежавшего английской короне [1, 7]. Пруссия же являлась главным союзником Франции в австро-французском антагонизме на континенте. Фридрих предлагал Людовику XV совместные боевые действия против Англии и Австрии (Франции – австрийскую Фландрию и английский Ганновер, Пруссии – австрийская Чехия, гегемония в Германии), однако Версаль отверг это предложение, не рассчитывая переносить борьбу с Англией на континент. Тогда Фридрих переориентируется на союз с Англией. Уильям Питт старший начал секретные переговоры с Фридрихом, результатом которых стала Вестминстерская конвенция. Это оголяет второй крупный узел противоречия: борьбу Пруссии и Австрии за доминирующую позицию в Центральной Европе.

Главным образом «революцией» во внешней политике Европы явилось прекращение многолетнего антагонизма Франции и Австрии и заключение между государствами военно-политического союза, к которому присоединяется Россия в 1756 г. Австрия стремилась взять у Пруссии реванш и не допустить становления Пруссии как новой сильной державы. Австрийский канцлер решил создать мощную антипрусскую коалицию с привлечением не только России, что не составляло особого труда, но и Франции, что являлось невероятно сложной задачей [2]. В 1751 г. Венцель Антон Кауниц назначен австрийским послом в Париже [3]. Он грамотно использовал слабости Людовика XV: несамостоятельность в принятии важных политических